УДК 82.09 (476)

# ЭТНА-ЭСТЭТЫЧНЫ КАНТЭКСТ У СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТАРЫЧНАЙ ПРОЗЕ

***канд. філал. навук, дац. В.Ю. БАРОЎКА***
***(Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава)***

*Аналізуюцца сэнсава-эстэтычныя функцыі фальклорных і этнаграфічных элементаў у сучаснай белорускай гістарычнай прозе.*

Новыя сацыяльна-палітычныя рэаліі, якія склаліся з другой паловы 80-х гадоў мінулага стагоддзя, абумовілі актыўны зварот беларускіх пісьменнікаў да гістарычнай тэмы. Асэнсаванне мінулага мела на мэце найперш прасачыць гістарычную повязь часоў і пераканаць грамадства ў велічы нашай мінуўшчыны, міфалагізаваць яе. У свой час М. Каулі трап на заўважыў: «Нацыя без міфалогіі яшчэ не нацыя, а толькі збор індывідуумаў, якія пражываюць на агульнай тэрыторыі і падначальваюцца агульным законам пастолькі, паколькі за гэтым наглядае паліцыя» [I, с. 260].

Сучасная беларуская гістарычная проза арыентуецца на «ідэйна-тэматычнае, уласна вобразнае, структурнае ўзбагачэнне» [2, с. 200]. Літаратура заключав ў сабе чалавеказнаўчы і народазнаўчы пафас. Любы твор прыгожага пісьменства ўтрымлівае, хаця б у мінІмальным варыянце, этна-эстэтычную інфармацыю. Этна-эстэтычны кантэкст адыгрывае важную ролю ў творах на гістарычную тэму. Мастацкі этнаграфізм або этна-эстэтычны матэрыял можна ў значнай ступені лічыць яе жанравай прыналежнасцю, бо аўтар, калі распавядае пра падзеі, аддаленыя ад нас у часе, вымушаны ўводзіць апісанне спецыфічных асаблівасцей культуры людзей пэўнага часу. Варта падкрэсліць, што этна-эстэтычны кантэкст мастацкіх твораў забяспечваецца ўвядзеннем карцін народнага быту, паданняў, пры казак, прымавак, песенъ і залежыць, у першую чаргу, ад аўтарскай задумы. Этна-эстэтычны кантэкст па-рознаму ўводзіцца ў творы беларускіх празаікаў і выконвае розныя функцыі ў залежнасці ад мастацкага светабачання пісьменніка і яго творчых задач, у залежнасці ад той стылёвай плыні, прыхільнікам якой выступав пісьменнік.

Рамантычная плынь у сучаснай гістарычнай прозе прадстаўлена творамі Вольгі Іпатавай. Для пісьменніцы не характэрна празмернае захапленне гістарычнымі звесткамі, яна імкнецца прытрымлівацца агульных правілаў гістарычнага жанру. Увагу гэтага аўтара прыцягвае беларускае Сярэднявечча, станаўленне нашай дзяржаўнасці ў глыбокай старажытнасці. У творах В. Іпатавай даецца шмат звестак пра жыццё нашых продкаў: пісьменніца згадвае пра язычніцкіх багоў і нячысцікаў, апісвае народныя звычаі, быт прадстаўнікоў тагачаснага грамадства. Этна-эстэтычныя звесткі ў прозе Іпатавай часцей за ўсё ўплятаюцца ў сюжэт. Так, у аповесці «Вяшчун ГедзІміна» многія персанажы язычніцкай міфалогіі беларусаў прадстаюць перад намі ў снах і ўяўленнях галоўнага героя Ляздзейкі, нязмушана ўспамінаюцца ў маналогах персанажа-апавядальніка, кшталту: *«Я* чамусьці ўспомніў, што мне трыццаць сем, а твар мой падобны да твару *Жыжаля*, бога падземнага агню - смуглявы і абветраны» [3, с. 76]. Этна-эстэтычны кантэкст арганічна ўваходзіць у прозу В. Іпатавай, стварае нацыянальна-непаўторны воблік часу. Напрыклад, у рамане «Альгердава дзіда» падзеі адбываюцца ў перш ай палове XIV стагоддзя, калі яшчэ не закончылася процістаянне язычнітва і хрысціянства. Шмат увагі ў творы надаецца апісанню матэрыяльнага свету і духоўнай культуры таго перыяду, уяўленняў пра свет і жыццё, звычаям. Этнаграфічныя звесткі ў рамане адначасова характарызавалі час і герояў. Вось як падаецца адчуванне Альгердавага слугі, што спыніўся на начлег у доме каваля: «І ўсё ж - блізіцца вечар, хутка пачнуць валадарыць *начніцы і мешы, прахі ды паўночнікі,* а нячыстая сіла, кажуць, асабліва любіць кавалёў» [4, с. 20]. Творы Іпатавай прасякнуты рамантычным пафасам, для аддюстравання жыцця пісьменніца выбірае яркія, запамінальныя дэталі, цягацее да метафарычнага паказу прадметнага свету. Этна-эстэтычныя дэталі ў пісьменніцы не толькі «прадстаўляюць» абставіны і герояў, але і надаюць аўтарскім радкам паэтычнае гучанне, тыпу: *«Жыцень* ужо сабраў у свае пуні сёлетні ўраджай...» [4, с. 45]. Раманы В. Іпатавай «За морам Хвалынскім», «Залатая жрыца Ашвінаў», «Альгердава дзіда», аповесць «Вяшчун Гедзіміна» насычаны разнародным этна-эстэтычным матэрыялам, аднак этнаграфічнае ў яе творах не пераважае над псіхалагічным.

Уладзімір Арлоў, Леанід Дайнека, Вітаўт Чаропка, Кастусь Тарасаў, Генрых Далідовіч, Алесь Пашкевіч - прадстаўнікі рэалістычна-аналітычнага пачатку ў гістарычнай прозе, таму этнаграфічна-бытавая канкрэтыка ў іх творах галоўным чынам перадае дух часу, каларыт эпохі. Уладзімір Арлоў не з’яўляецца прыхільнікам разгорнутых апісанняў быту, этна-эстэтычны кантэкст у яго прозе прысутнічае ў выглядзе трапных мастацкіх дэталей, кароткіх гістарычных каментарыяў, болын-менш падрабязныя звесткі падаюцца ў тых творах, дзе герой-чужаземец назірае за жыццём беларусаў («Сны імператара», «Пішу вам ў Масковію...»). Леанід Дайнека пэўную ўвагу ў сваіх творах ўдзяляе карцінам быту і пейзажным зама-

лёўкам, якія прадстаўляюць нацыянальны свет, у прозе Г. Далідовіча назіраецца імкненне праз бытавыя дэталі паказаць час і чалавека. У рамане «Кліч роднага звона» перад намі прадстае не гераічны, а найперш бытавы воблік XIII стагоддзя. Наступны эпізод надзвычай характэрны для творчай манеры пісьменніка: «На Багача ўжо ўсё прыбралі з поля і гародаў; буслы адляцелі - значыць, зіма сёлета магла быць ранняя і халодная; жанчыны пачалі даставаць верацёны, патроху прасці; на Здвіжанне амаль ніхто не асмельваўся паткнуцца ў лес: казалі, там ужо спаўзліся ў клубкі гадзюкі і вужы перад тым, як зашыцца ў карчы ці норы на зіму. Калі хто ўпотай ад людскіх вачэй падкрадваўся да тых змяіных скопішчаў, дык толькі са злымі намерамі: абсачыць сярод іх змяінага цара, лупянуць па ім, ухапІць з яго галавы залатую карону і збегчы - гэтая залатая карона спрыяе чарадзеям і злодзеям. За такое злыдушцаў заўсёды каралі. Вось і сёлета, як былі чуткі, у адным паселішчы злавілі такога зламысніка, і старэйшыны прысудзілі яму смерць: яму звязалі рукі за спіной, прычапілі камень да шыі і, разгайдаўшы, шпурнулі ў раку...» [5, с. 197]. Такога тыпу дэталі разбуралі не толькі рамантычны флёр, але і «падрывалі» гістарычны фон. У творах К. Тарасава «Тры жыцці княгіні Рагнеды», «Пагоня на Грунвальд», «Апошняе каханне князя Міндоўга», у рамане «Пляц ВолІ» А. Пашкевіча предметам пісьменніцкага асэнсавання становіцца асоба, а роля этна-эстэтычнага фону здрабняецца, адыходзіць на перыферыю.

В. Чаропка - аўтар белетрызаваных нарысаў «Імя ў летапісе», рамана «Храм без бога». Для гэтага пісьменніка характэрна ўвядзенне этна-эстэтычных дэталей не толькі ў ролі характаратворчай, але і ў ролі сэнсапараджальнай. Так, раман «Храм без бога» Чаропка спачатку хацеў назваць «Ваўкалак», каб такім чынам сімвалізаваць жыццёвы шлях аднаго з галоўных герояў - Міхайлы Глінскага, амбітнага гетмана, які не змог стань вышэй абставінаў, а вымушаны быў прыняць правілы палітычнай гульні, навязаныя яму недругамі. Да гістарычнай прозы блізкія творы апошніх гадоў Людмілы Рублеўскай (аповесць «Пярсцёнак апошняга імператара», апавяданні «Дом з драўлянымі львамі», «Слова гонару», «Гайвароны»), хаця іх аўтар катэгарычна заяўляе, што не піша на гістарычную тэму, а яе героі - плён пісьменніцкага ўяўлення і толькі. У названых творах этна-эстэтычны кантэкст «рэабілітуе» шляхецкае саслоўе, нярэдка ў іранічным плане паказвае нашых продкаў і сучаснікаў, узвышае высакародных па характары герояў.

Арыгінальны па форме і змесце раман УладзІміра Бутрамеева «Карона Вялікага княства», аўтар назваў свой твор дысертацыяй «у поўным сэнсе гэтага слова на тэму: хто ж такія беларусы, адкуль яны ўзяліся і што яны робяць у сусветнай гісторыі». Раман Бутрамеева вытрыманы ў іранічным стылі, у ім парадзіруюцца не толькі каноны дысертацыйныя, але і распаўсюджаны зараз у рускай літаратуры жанр «folk history», у якім шмат увагі надаецца менавіта бытавому фону, этна-эстэтычным дэталям. Як адзначыў В. Мяснікоў «folk history» звяртаецца не да розуму, а да эмоцый чытача, «тут няма месца сумнаму аналізу сацыяльна-эканамічных прычын і наступстваў, гісторыя падаецца на ўзроўні бытавой свядомасці» [6, с. 133]. Іронія і гераізацыя цесна перапляталіся ў аўтара, праз іранічную прызму ён глядзіць на нашу старажытную і нядаўнюю гісторыю, і гісторыю літаратуры ў прыватнасці, і разам з тым захапляецца людзьмі ўзвышаных пачуццяў, такімі як шляхціц Андрэй Ваўкоўскі, што прагне свабоды і славы роднаму краю. Дарэчы, прозвішча героя семантычна значнае, паходзіць ад аднаго з татэмаў беларусаў. Каб мець ўяўленне пра пісьменніцкую манеру апавядання дастаткова прыгадаць, напрыклад, радкі: «Как стало известно, что Адам и Ева были белорусами (так как они созданы были из белорусской глины, взятой специально для этого недалеко от Ивенца), возникло множество новых вопросов. Некоторые ученые указывали на отсутствие в Белоруссии вечнозелёных растений, необходимых для райского сада и собственно рая, в котором сразу после их создания жили Адам и Ева. Говорили и о том, что в белорусском фольклоре нет сведений о всемирном потопе, а те, что есть, заимствованы» [7, с. 39] (твор друкаваўся толькі на рускай мове - *В. Б.)*. У сучаснай беларускай гістарычнай прозе пашыраны два тыпы этна-эстэтычнага кантэксту: апісанне карцін быту, нораваў ў ролі пазнавальна-інфарматыўнай і характаратворчай, а таксама трансфармацыя, наданне шырокага абагульняючага значэння этнаграфічным дэталям, наданне ім новых сэнсавых нюансаў. Другі тып пакуль менш распаўсюджаны ў параўнанні з першым. Гэта можна растлумачыць тым, што беларускія пісьменнікі падыходзяць да асэнсавання гістарычнай тэмы перш за ўсё як асветнікі, а не як філосафы.

## ЛІТАРАТУРА

1. Каули М. Дом со многими окнами. - М., 1973.
2. Шынкарэнка В.К. Нястомных пошукаў дарога. Праблемы паэтыкі сучаснай беларускай гістарычнай прозы. - Мн., 2002.
3. Іпатава В. Вяшчун Гедзіміна // Маладосць. - 2000. - № 10.
4. Іпатава В. Альгердава дзіда // Полымя. - 2001. - № 9.
5. Далідовіч Г. Кліч роднага звона. - Мн., 1997.
6. Мясников В. Историческая беллетристика: спрос и предложение // Новый мир, - 2002. - № 4.
7. Бутромеев В. Корона Великого княжества // Дружба народов. - 1999. -№ 1.